Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Магілёве праваабаронцу "Вясны" Алеся Буракова асудзілі на 10 сутак

дапоўнена

15.05.2020 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, праваабаронцы, свабода мірных сходаў, затрыманні

У пятніцу, 15 мая, у 11 гадзін супрацоўнікі міліцыі затрымалі сябра магілёўскага аддзялення "Вясны" Алеся Буракова (Сашу Райкана). Яго затрымалі на кватэры, дзе ён жыў. Супрацоўнікі міліцыі павезлі праваабаронцу ў Ленінскае РАУС Магілёва. Імаверна, яго будуць апытваць па акцыях, якія праходзілі ў Магілёве 5 і 6 траўня.



Вядома, што супрацоўнікі міліцыі спрабавалі затрымаць Алеся Буракова яшчэ з 8 траўня. Раней двое сутак (з раніцы 8 траўня да ночы з 9 на 10 траўня) невядомыя людзі ў цывільным адзенні дзяжурылі пад будынкам, дзе знаходзіўся Алесь. Цікавіліся праваабаронцам і супрацоўнікі міліцыі ў затрыманага журналіста і праваабаронца "Магілёўскай вясны" **Александра Буракова**.

Праваабаронца "Магілёўскай вясны" **Барыс Бухель** мяркуе, што Алеся Буракова, як і іншых раней затрыманых, пратрымаюць выходныя ў ізалятары часовага ўтрымання, пасля чаго ў панядзелак адбудзецца суд. Верагодна, як і іншых магілёўскіх журналістаў, яго будуць судзіць па артыкуле 23.34

КаАП за тое, што ён асвятляў падзеі, якія адбываліся ў Магілёве 5 і 6 траўня. Праваабаронца Барыс Бухель маніторыць сітуацыю ў судзе Ленінскага раёна Магілёва на той выпадак, калі журналіста ўсё ж вырашаць судзіць у пятніцу, 15 траўня.

Дапоўнена. Судзіць Алеся Буракова вырашылі ўсё ж такі ў пятніцу. Суд пачаўся ў 17:30 у судзе Ленінскага раёна. Суддзя — **Ланчава**. Як паведаміў праваабаронца "Вясны" **Аляксей Колчын**, на судовы працэс Алеся не дапусцілі нікога: ні праваабаронцаў, ні бацькоў. Суд, па сутнасці, таемны, бо нават у раскладзе няма інфармацыі.

У выніку суддзя суда Ленінскага раёна Магілёва прызнала вінаватым Алеся Буракова па арт. 23.34 КаАП, што ён нібыта ўдзельнічаў у акцыі 6 траўня пад магілёўскім ІЧУ, і асудзіла сябра "Вясны" на 10 сутак адміністрацыйнага арышту.

Адбываць пакаранне ён будзе ізалятары часовага ўтрымання УУС Магілёўскага аблвыканкама (вуліца Крупскай 99Б, г. Магілёў, 212011). На волю выйдзе ў 11 гадзін 25 траўня. Заклікаем падтрымаць нашага сябра паштоўкамі і лістамі падтрымкі!



За акцыі "на суткі" адправілі дзясяткі чалавек. Падтрымай іх паштоўкай салідарнасці

Некалькі дзён запар у розных гарадах краіны працягваецца пераслед грамадзян, якія выходзілі на мясцовыя акцыі пратэсту: у падтрымку экаактывістаў Берасця ("кармленне галубоў") і ў падтрымку блогера Сяргея Ціханоўскага. Не абышлося і без адміністрацыйных арыштаў. Суды адпраўляюць некаторых "на суткі" за ўдзел у мірных сходах па артыкуле 23.34 КаАП. Пры гэтым праваабаронцы "Вясны" заклікаюць беларускія ўлады адмовіцца на перыяд абвешчанай пандэміі ад прымянення адміністрацыйных затрыманняў на тэрмін звыш 3-х гадзін і адміністрацыйных арыштаў.

Нагадаем, 8 траўня таксама быў затрыманы праваабаронца і журналіст "Магілёўскай вясны" Аляксандр Буракоў. Яго затрымалі 8 траўня каля суда, дзе ён збіраўся ажыццяўляць маніторынг. Выходныя ён правёў у ІЧУ. 12 траўня суд Ленінскага раёну Магілёва абвінавацiў праваабаронцу ў 2-хвілінным удзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве і асудзіў на **10 сутак** адміністрацыйнага арышту.

Рада Праваабарончага цэнтру “Вясна” патрабуе неадкладна вызваліць затрыманага Аляксандра Буракова і спыніць яго пераслед ў сувязі з праваабарончай дзейнасцю.



Патрабуем неадкладнага вызвалення арыштаваных сябраў ПЦ “Вясна” і спынення іх пераследу ў сувязі з праваабарончай дзейнасцю

Заява Рады Праваабарончага цэнтру “Вясна”

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

